МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# МАТЕРИАЛЫ
# МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

**г. Барановичи**
**16–17 декабря 2003 года**

**В 2 частях**
**Часть 1**

**Барановичи**
**2003**

УДК 082 (043.2)
ББК 94
М 33

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер; доктор психологических наук, доцент В.А. Янчук

**Редакционная коллегия:** Л.Ф. Мирзаянова (главный редактор), Е.И. Белая, И.В. Вакульчик, В.Н. Зуев, А.А. Ковалевская, Ю.В. Маслов, Е.И. Пономарева, Н.М. Сотник (1–3 направления), Е.Г. Карапетова, Ю.В. Маслов (4 направление), Е.И. Белая (5 направление), Е.Л. Малиновский, Е.И. Белая (6 направление)

**Материалы международной научно-практической**
М 33 конференции молодых исследователей, Барановичи, 16–17 дек. 2003 г.: В 2 ч. Ч. 1 / Редкол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.) и др.– Барановичи: БГВПК, 2003.– 562 с.

ISBN 985-6616-08-5.
ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1).

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

В сборнике содержатся статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей.

Материалы теоретического и практико-ориентированного характера могут быть использованы преподавателями вузов, ссузов, учителями школ и студенческой молодежью, интересующейся научно-исследовательской деятельностью.

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

**УДК 082 (043.2)**
**ББК 94**

**ISBN 985-6616-08-5**
**ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1)**

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2003

раскрывае не толькі духоўны патэнцыял асобы, а саму ідэйна-маральную накіраванасць, сутнасць духоўнасці.

2. Творы сучаснай беларускай паэзіі ўзбагачаюць чалавека духоўна, адлюстроўваюць значную напружанасць духоўнага, інтэлектуальнага жыцця чалавека на мяжы эпох, шматграннасць яго інтарэсаў, інтэнсіўнасць спасціжэння духоўных каштоўнасцей, сярод якіх застаюцца вечнымі маці, бацькоўская зямля, любоў да бліжняга і клопат пра будучыню.

3. Духоўныя каштоўнасці як ідэйна-філасофская аснова беларускай паэзіі ёсць магутны сродак для духоўнага і грамадзянскага станаўлення асобы.

### Літаратура


1. Бельскі А.І. Паэзія // Гісторыя беларускай літаратуры: У 4 т. / Нац. акад. Беларусі; Ін-т літ. імя Я. Купалы.– Т. 4. Кн. 2.– Мн., 2003.
2. Бельскі А.І. Краса і смутак: Дапам. для настаўнікаў.– Мн., 2000.
3. Жураўлёў В.П. У пошуку духоўных ідэалаў.– Мн., 2000.
4. Иванов А.В. Учебное пособие по изучению литературоведческих методологий XX века.– Могилев, 1998.
5. Лойка А.А. Галгофа: Кніга лёсаў.– Слонім, 2001.
6. Лойка А.А. Паэзія і час.– Мн., 1981.
7. Мінчанчук М.І., Шпакоўскі І.С. Беларуская літаратура XX ст.– Мн., 2002.
8. Рагойша В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах.– Мн., 2001.
9. Родная песня: Зборнік беларускай сучаснай паэзіі / Укл. У. Дзіско; Прадм. А. Бельскага.– Мн., 1997.


## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША М. БАГДАНОВІЧА "ЗОРКА ВЕНЕРА"


**В.С. Пушко, Н.А. Шэпетунка**

Беларусь, г. Баранавічы

Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж

Навуковы кіраўнік – В.М. Шавель, старшы выкладчык


Славуты раманс Максіма Багдановіча, што пачынаецца словамі "Зорка Венера...", даўно стаў паэтычным сімвалам Беларусі, дасканалым увасабленнем чалавечай прагі хараства і гармоніі. Галоўны матыў верша – матыў кахання. Увогуле, тэма кахання дамінуючая ў паэзіі Багдановіча. Такой канцэнтрацыі пачуццяў кахання, яго пераходаў, пераліваў да Багдановіча беларуская паэзія не ведала. І найбольшая заслуга паэта ў тым, што ён на першае месца

паставіў пачуццё асобы, яе ўнутраны свет. І як прыклад і пацвярджэнне гэтаму – верш "Зорка Венера".

Шукаючы разгадку незвычайнай папулярнасці "Зоркі Венеры", нельга абысці ўвагай сам вобраз апаэтызаванай М. Багдановічам зоркі. М. Багдановіч часта глядзіць на неба. І адухоўленая прырода пераклікаецца з сэрцам і душэўным станам паэта. У вершы паэт геніяльна персаніфікуе вобраз зоркі, дае ёй імя, прычым дакладна адпаведнае з пункту гледжання астраноміі і астралогіі: менавіта Зорка Венера лічыцца "апякункай кахання". І вобраз Зоркі Венеры дапамагае аб'яднаць у адно цэлае розныя часовыя вымярэнні: той час, калі ствараўся верш, і ранейшы, з якімі звязана нараджэнне кахання, яго росквіт, вымушанае расстанне, абяцанне кахаць і спадзяванне застацца ў памяці каханай. Зорка Венера, якую бачыць герой вечарам, нагадвае пра каханне. Яна была сведкай сустрэчы, спрыяла росквіту кахання і, насуперак абставінам, якія раз'ядналі каханых, дапамагае нанова перажыць асалоду кахаць і быць каханым.

У каментарыі да трохтомнага поўнага збору твораў М. Багдановіча сцвярджаецца, што "Зорка Венера" ("Раманс") – адзіны твор лірыкі любоўных перажыванняў у зборніку "Вянок", які мае канкрэтнага адрасата. Адрасатам з'яўляецца Аня Какуева, якой прысвечаны цыкл "Мадонны" і якая была для паэта найвышэйшым ідэалам хараства, жаноцкасці. У апошнія гады вучобы ў гімназіі М. Багдановіч пасябраваў з Рафаілам Какуевым – братам Ані. І таму ён стаў часта бываць у доме Какуевых. Знаёмства з Аняй, размовы з ёй былі лепшымі часамі жыцця. Але Аня не змагла здзейсніць высокіх паэтавых спадзяванняў. Яна абрала не таленавітага, але хворага Максіма, а здаровага і матэрыяльна забяспечанага чалавека, які асаблівым талентам не вызначаўся.

З гэтым меркаваннем не хочацца згаджацца. Раманс, як і шэраг іншых, вельмі моцных па гучанні вершаў, напісаны пасля наведвання Беларусі. Дакрануўшыся да роднай зямлі, Багдановіч, нібы міфічны Антэй, адчуў незвычайны прыліў паэтычных сіл. Можна смела сказаць, што многія ўспрымаюць гэты верш як прысвячэнне Радзіме. І радкі: "Буду ў далёкім краю я нудзіцца, у сэрцы любоў затаіўшы сваю..." – тады ўспрымаюцца інакш. Пабываўшы на Радзіме, на Беларусі, падыхаўшы яе паветрам, пахадзіўшы па яе зямлі, палях, лясах, лугах, лірычны герой можа назваць месца, дзе ён жыве, "далёкім краем". Як мы бачым, існуюць два меркаванні наконт адрасата верша. Але гэта не прычыны для спрэчкі. Больш таго, гэта яшчэ раз пацвярджае справядлівасць наступнай схемы:

<table>
<tr><td rowspan="3">A – M – H</td><td>$H_1$</td></tr>
<tr><td>$H_2$</td></tr>
<tr><td>$H_3$</td></tr>
</table>

,

дзе $H_1$, $H_2$, $H_3$ – колькасць варыянтаў прачытання, і тым самым дазваляе сцвярджаць, што М. Багдановіч – паэт высокай мастацкай культуры, глыбокай паэтычнай думкі і вялікага лірычнага пачуцця.

Звернемся непасрэдна да тэксту, гэта дапаможа раскрыць таямніцу прыцягальнасці верша. Верш уяўляе сабой "вершаванае пісьмо", зварот да каханай дзяўчыны. Ён мае свае асаблівасці.

Невялікі памер, любоўная тэма, меладычнасць верша дазволілі Багдановічу назваць яго менавіта рамансам. І, чытаючы назву, кожны ўжо прыкладна ўяўляе тое, аб чым будзе верш, які сам просіцца стаць песняй.

Вельмі важную інфармацыю нясуць моцныя пазіцыі верша, а менавіта апошні і першы радкі. Яны ўтвараюць своеасаблівую сэнсавую рамку. І ўжо па гэтых радках можна зразумець асноўную думку.

Паэт знайшоў на дзіва простыя і адначасова прыгожыя велічныя словы, зразумелыя кожнаму. Можна заўважыць, што верш не вельмі насычаны стылістычна-маркіраванымі элементамі (эпітэтамі, метафарамі). Разгледзім эпітэты. Кожны мае дадатковую нагрузку: выдзяляючы і аналізуючы некаторыя эпітэты, можна заўважыць, што пры дапамозе іх чытач "пазнае" гэты верш рознымі аналізатарамі. Напрыклад: "неба начное". Адныя ўяўляюць зорнае начное неба, бачаць яго, а другія, чытаючы гэтыя словы, "чуюць" цішыню, якая напаўняе карціну.

Разгледзім яшчэ адзін, даволі цікавы эпітэт: "светлыя згадкі". Чаму менавіта "светлыя"? Таму, што яны – святочныя і прыемныя, а яшчэ салодкія...

Удалае і спалучэнне слоў "ціхае каханне". Лірычны герой кахае не проста. А ціха, незаўважна. І другія, магчыма, не разумеюць, што ён закаханы. Але для героя гэтае каханне – жыццё.

Яшчэ адзін яскравы прыклад надзвычайнага таленту – спалучэнне слоў "уваскрэсла каханне". Усім вершам аўтар даказвае, што "ціхае каханне" жыве ў сэрцы героя, якому дастаткова яшчэ раз зірнуць на Зорку Венеру – і пачуццё праяўляецца з ранейшай сілай, адраджаецца...

Гаворачы пра лексічны ўзровень аналізу, нельга абысці (і больш таго, мэтазгодна правесці) лінгвістычны эксперымент са словам "нудзіцца". Падбярэм сінонімы – гараваць, сумаваць, пакутаваць.

Гаруюць, як правіла, аб памерлым, пакутуюць ад няшчаснай долі, сумуюць аб тым, чаго не вернеш. А трапна падабранае слова "нудзіцца" ўвабрала ў сябе пэўную частку ўсіх гэтых паняццяў. Герой будзе нудзіцца ад таго, што каханая далёка. Ад сваёй затоенай любві, ад той трывогі, якая з'яўляецца кожны раз, калі ён бачыць Зорку Венеру.

Вялікую цікавасць уяўляе даследаванне марфалагічнага ўзроўню верша: са 107 слоў пераважная большасць – назоўнікі і дзеясловы (26 і 19 адпаведна), якія малююць запаволеную дынамічную карціну; сем выкарыстаных паэтам эпітэтаў-прыметнікаў дадаюць шматграннасці і незвычайнасці адлюстраваным у вершы з'явам і пачуццям.

У вершы надзвычай шмат займеннікаў. Асноўныя: "я", "ты" і "мы". А яшчэ – "яна" – Зорка. Своеасаблівы трохкутнік.

Нельга абысці ўвагай і тое, што аўтар выкарыстоўвае ў большасці трохскладовыя і двухскладовыя словы. Гэта запавольвае тэмп чытання і спрыяе стварэнню вальсавасці (пры жаданні верш можна прагаварыць пад лік "1 – 2 – 3"...). І не трэба быць вельмі адораным, каб адчуць, што гэты верш надзвычай меладычны, музычны. У многім музычнасць абумоўлена менавіта асаблівасцямі фанетычнай арганізацыі верша, які адрозніваецца паўнагалоссем, нідзе няма збегу зычных, якія перашкаджалі б голасу. Назіраецца асананс гукаў а-о-э, і інструментоўка вытрымана ад пачатку да канца. Дзякуючы паўтору гэтых галосных аўтар паказаў не толькі прастор зорнага неба, але і засяродзіў нашу ўвагу на тым, што зорка ўзыходзіць не ў адзін момант, а паступова, ды і ўвогуле само дзеянне верша ахоплівае працяглы час і аб'ядноўвае і мінулае, і цяперашні час, і ў пэўнай ступені будучае.

Вельмі выразна назіраецца алітэрацыя зычных з-с-ц у пачатку верша і гукаў ч-ц-х-с-ш – затым. Гэтыя глухія і свісцячыя ствараюць рамантычны, прыўзняты настрой і дапамагаюць перадаць стан прыроды, а менавіта адчуванне цішыні і спакою, якія пануюць навокал.

Сінтаксічны аналіз дапамагае зразумець структуру тэксту і выявіць асаблівасці стылю аўтара. У вершы назіраецца адваротны парадак слоў: "неба начное", "казаў я", "дзівіцца буду", "зліём мы" і г.д. Аўтар звяртае ўвагу чытача на гэтыя выразы і надзяляе іх пэўнай эмацыянальна-пачуццёвай афарбоўкай, робіць больш адчувальнай дынаміку верша.

На працягу ўсяго верша аўтар звяртаецца да "той", што пабудзіла "выліць душу" на паперу. Ён гаворыць: "глянь", "помніш", "дарагая".

Верш не разбіты на страфы. І менавіта гэта ў многім вызначае ўспрыманне верша як адзінага цэлага, непаўторнага "паслання". Але можна заўважыць спецыфічныя страфы, утвораныя страфічным кальцом.

Адразу прыцягвае ўвагу выкарыстанне шматкроп'яў. Яны перадаюць незакончанасць думкі, душэўныя перажыванні героя.

Верш "Зорка Венера" – твор, які мае права звацца геніяльным шэдэўрам беларускай і сусветнай літаратуры. Верш пра вечныя пачуцці, якія не знікнуць, пакуль не знікнуць людзі на Зямлі.


**Літаратура**

1. Барсток М.М. Максім Багдановіч у школе.– Мн., 1991.
2. Бачыла А. Дарогамі Максіма Багдановіча.– Мн., 1993.
3. Зубараў Л. Максім Багдановіч.– Мн., 1989.
4. Кабаковіч А.К. Паэзія Максіма Багдановіча.– Мн., 1978.


## АРХЕТЫП ПТУШКІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ


**А.А. Рагалінская, Ж.В. Салдаценкава**

Беларусь, г. Баранавічы

Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж


Архетып – адзін з цікавых мастацкіх вобразаў, якія даследуюцца сённяшнім літаратуразнаўствам. Бо якраз архетыпы дазваляюць разглядаць самабытную нацыянальную літаратуру як частку сусветнага літаратурнага кантэксту, раскрываюць універсальнасць яе зместу, даносяць нацыянальныя каштоўнасці прадстаўнікам іншых культурных традыцый і часавых вымярэнняў.

У літаратуразнаўства паняцце архетып (ад грэч. першавобраз) прыйшло з аналітычнай псіхалогіі. Згодна з Карлам Юнгам, швейцарскім вучоным, архетып – гэта агульначалавечы вобраз, які неўсвядомлена перадаецца з пакалення ў пакаленне. Але ўзноўлены архетып, які па сваёй сутнасці нейтральны ў адносінах да дабра і зла, заўсёды напаўняецца новым, сучасным зместам [3; 9]. Рэпрадукцыя архетыпа з агульначалавечага неўсвядомленага (бессвядомага) у нацыянальных літаратурах і дазваляе сцвярджаць існаванне сусветнай культурнай традыцыі.

Філосаф, эстэтык, даследчык айчыннай літаратуры Уладзімір Конан піша: "Ёсць знешняя, паказная, а ёсць унутраная, сутнасная, упісанасць рэгіянальнай і нацыянальнай культуры ў культуру сусветную. Першая залежыць ад выпадковых знешнепалітычных